# «ДАЖЫНКІ» – СВЯТА ЎРАДЖАЮ (ТРАДЫЦЫІ І СУЧАСНАСЦЬ)

УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»
**Юхнавец П.М., студэнтка 1 курса факультэта фінансаў і банкаўскай справы**
Кафедра беларускай і рускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Агароднікава С.В.

Белауская зямля заўсёды была багатай на святы, абрады і звычаі. Многія з іх узніклі ў тыя далёкія часы, калі нашы продкі пакланяліся розным духам і багам. Зямля для беларусаў была карміцелькай, таму яны адносіліся да яе як да святыні. Менавіта таму «Дажынкі» былі адным з самых значных святаў нашых продкаў, сапраўдным святам ураджаю.

«Дажынкі» (дожын, дожні, пажынкі, пажыналкі, выжынкі, абжаткі, аспажынкі, спажынкі, успажынкі, Спажыніца, Спажын, Гаспажынкі, Гаспожкі, Успеншчына) – апошні дзень жніва (часцей за ўсё, дажынкі прымяркоўваліся да Трэцяга Спасу), у які здзяйсняліся рытуальна-магічныя дзеянні, што азначалі сабою завяршэнне збору ўраджаю, суправаджаліся народнымі абрадамі, танцамі, песнямі; продкі былі ўдзячныя «духам нівы» за хлеб і прасілі даць урадлівасць і на наступны год.

Асноўным абрадам гэтага свята быў абрад “завівання барады”. Закончыўшы жніво, жнеі пакідалі невялікі кавалак нязжатага жыта, старанна яго выполвалі, заклікаючы ваўкоў, мядзведзяў “бараду палоць”. Акрамя “барады”, існавалі і іншыя назвы – “кукла”, “перапёлка”, “каза”, “кветка”, “каса”, “спарыня”. Выпалаўшы, каласы злучалі зверху, абвязвалі поясам ці перакручаным жытам, на зямлю клалі хлеб, соль, часам яйкі, каменьчыкі, “бараду” упрыгожвалі кветкамі, ягадамі рабіны. У залежнасці ад мясцовай традыцыі, “бараду” проста пакідалі на полі (у гэтым выпадку яе заворвалі на наступны год) або на пакідалі толькі сцябліны, а каласы зжыналі і ўплялі ў дажыначны вянок, а ў саму “бараду” ўтыкалі толькі тры каласкі. У некаторых вёсках Бераставіцкага і Мастоўскага раёнаў замест “барады” рабілі “касу” альбо “перапёлку” – пакінутыя каласы сплялі ў касу, упрыгожвалі кветкамі. “Касу” зразалі сярпом ля самай зямлі і з песнямі неслі гаспадару. За “касу” гаспадар павінен быў пачаставаць жней. Зрабіўшы “бараду”, жнеі садзіліся вакол яе і спявалі “жніво”.

Цесна звязаны з гэтым рытуалам быў выраб апошняга снапа (“дажынка”), які спарадычна сустракаўся ў мясцовай традыцыі. Яго рабілі вялікім, вязалі адмысловым спосабам і таксама ўпрыгожвалі, часам у гэты сноп клалі “касу”. У некаторых вёсках Шчучынскага раёна апошні сноп вязалі ў выглядзе “дзеда”, які адносілі гаспадару. Паўсюдна ў рэгіёне плялі дажынкавы вянок (таксама з апошняга калосся). Гэты вянок, упрыгожаны кветкамі і рабінай, неслі да гаспадара, а той частаваў жней за працу.

Ішлі гады… Шмат выпрабаванняў выпала на дою беларускага народа. Але і новыя пакаленні захавалі любоў да роднай зялі, да культуры свайго



Репозиторий ГрГМУ

народа. Зараз святкаванне «Дажынак» змянілася, але ў аснове сучаснага свята “завіванне барады”, “каса”, дажынкавы вянок – абрады, якія пакінулі нам нашы продкі.

У 1996 годзе ў Беларусі з'явілася новае свята – Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі, або рэспубліканскія «Дажынкі». Праводзяцца яны ў самых розных кутках краіны, у 2013 годзе, напрыклад, хлебаробы Беларусі збіраліся ў Жлобіне, а ў 2016 годзе – Мсціслаўалі. Як ужо адзначалася раней, у сучасных «Дажынак» з цягам часу з'явіліся свае традыцыі. Горад, які выбіраецца для правядзення «Дажынак», рыхтуецца да свята на працягу года. Гэтае свята пачынаецца з шэсця ўдзельнікаў па цэнтральнай вуліцы горада-гаспадара. Праходзяць «Дажынкі» звычайна на працягу некалькіх дзён. На пачатку заўсёды падводзяцца вынікі ўборачнай кампаніі, узнагароджваюцца лепшыя хлебаробы краіны. Адбываюцца канцэрты і выставы народнай творчасці, дэманструецца сельскагаспадарчая тэхніка і прадукцыя. Песні, танцы, нацыянальная кухня, сучасная і народная культура – свята атрымліваецца маштабным і маляўнічым. Аднак як і раней жнеі з сярпамі выступаюць абавязковымі ўдзельнікамі свята "Дажынкі", захаваўся "дажыначных сноп", вянок з каласоў, каравай са збожжа новага ўраджаю. Дажынкавы сноп звычайна ўручаюць кіраўніку гаспадаркі. Вянкамі, хлебам-соллю вітаюць лепшых майстроў уборачнай кампаніі. Сёння мы бачым, што народныя традыцыі знайшлі свой працяг і ў XXI стагоддзі. Такое маштабнае святкаванне «Дажынак» характэрна толькі для Беларусі. Больш ні адна краіна на постсавецкай прасторы не святкуе заканчэнне жніва з такім размахам. Акрамя рэспубліканскіх “Дажынак” існуюць абласныя і раённыя «Дажынкі», дзе таксама аддаюць даніну даўняму беларускаму святу.

І сучаснае, і наступныя пакаленні заўсёды будуць з належнай павагай ставіцца да традыцый нашых продкаў, бо ў кожнай з іх – душа і сэрца беларускага народа.

ЛІТАРАТУРА:

1. Обычаи и традиции Беларуси // Дожинки [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://probelarus.by/belarus/information/tradition/dozinki_obychai_i_tradici.html. – Дата доступа: 18.09.2012.
2. Абʼекты этнічнага турызму // Народня звычаі і абрады [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ethno-tour.grsu.by/by/ethnic-tourism-sights-by/national-traditions-and-customs/157-dazhynki. – Дата доступа: 25.02.2013.
3. Святы і абрады беларусаў // Дажынкі [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://jivebelarus.net/our-heritage/belarusian-holiday-and-ceremony.html – Дата доступа: 06.12.2007.

Репозиторий ГрГМУ